

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №2
Кастрычнік 2019

# З ДНЁМ НАСТАЎНІКА!

**Паважаныя настаўнікі!**

Віншуем вас з вашым прафесійным святам! Няхай кожны поспех любога з вучняў будзе гонарам для вашага сэрца. Няхай кожны ўрок, дадзены вамі, дорыць дзецям не толькі веды і ўменне развражаць, але і веру ў добрае, надзею на лепшае, рознакаляровыя мары і сілу імкнення да іх. Заставайцеся мудрымі і добрымі, тымі, хто разумее і ведае, цікавымі і выдатнымі настаўнікамі, на жыццёвай дарозе якіх гараці агні ўдачы, шчасця і любові!





Вучні 5 і 9 класаў сумесна з класным кіраўніком Хацкевіч А.М. падрыхтавалі для нашых настаўнікаў віншаванні, якія пачаліся з самай раніцы, перад прыходам многіх настаўнікаў на працу.








Кожны з настаўнікаў быў прыемна ўражаны.



# ЭКСКУРСІЯ НА ЗАВОД “БелАЗ”

Завод «БелАЗ», адзін з лідэраў сярод вытворцаў гіганцкіх кар'ерных самазвалаў, знаходзіцца ў горадзе Жодзіна, што ў 44 км ад Мінска. Прадпрыемства, якое калісьці пачыналася як зборачны цэх 25-тонных самазвалаў МАЗ, з кожным годам павышала планку грузападымальнасці. І вось за 60 гадоў існавання завод выпусціў ужо 145 тыс. грузавікоў, самыя буйныя з якіх здольныя перавозіць да 450 т. Гіганцкія машыны зачароўваюць, таму нядзіўна, што з нядаўніх часоў адміністрацыя «БелАЗ» вырашыла прыадчыніць заслону таямніцы і расказаць жадаючым аб працэсе стварэння гэтых жалезных гігантаў.




**Гэта цікава!!!!**

Завод займае плошчу ў 1,68 км² - гэта каля 260 стандартных футбольных палёў. Таму па тэрыторыі «БелАЗ» турыстаў возяць на аўтобусе, спыняючыся па меры неабходнасці.

# Прывітанне з Жодзіна!

Экскурсія на «БелАЗ» складалася з двух частак: наведванне музея і знаёмства непасрэдна з самазваламі. Музейная экспазіцыя размешчана ў будынку заводакіраўніцтва. Самая прыкметная яе частка - мадэлі выпускаемай прадпрыемствам тэхнікі. Ды і самі макеты, дзякуючы сваёй аўтэнтычнасці, заслугоўваюць увагі. Таксама ў экспазіцыі прадстаўлены фатаграфіі, дакументы, узнагароды, кавалкі горных парод і мінералаў, якія былі здабытыя, дзякуючы працы тэхнікі «БелАЗ». Пасля аповяду пра гісторыю і дасягненні завода, экскурсія працягваецца на выставачнай пляцоўцы пад адкрытым небам.





Затым наведвальнікі прыбываюць да зборачным цэху, каля якога знаходзіцца стаянка з прадукцыяй завода. Але дзесяткі прыпаркаваных тут шматтонных грузавікоў губляюцца у параўнанні з гігантам, здольным перавозіць 450 т. Гэты гігант, магутнасцю 4600 конскіх сіл, нават занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Справа гонару для турыста - сфатаграфавацца побач з колам грузавіка, якое ў некалькі разоў вышэй за чалавечы рост.











Рэдкалегія: вучні 8 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 8 класа.